**УДК 821.161**

# СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД ДА АРГАНІЗАЦЫІ МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ З МАЛАДЫМІ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ, НАКІРАВАНАЙ НА ПАВЫШЭННЕ ПАКАЗЧЫКАЎ АЛІМПІЯДНАГА РУХУ

***С. С. Маліноўская***
*УА «Магілёўскі дзяржаўны абласны інстытут развіцця адукацыі», метадыст аддзела сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*

Адным з самых значных складнікаў нацыянальнай сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь вызначаецца алімпіядны рух. Удзел у інтэлектуальных спаборніцтвах па вучэбных прадметах адыгрывае жыццясцвярджальную ролю ў фарміраванні асобы дзіцяці, выхоўваючы адказнасць за пачатую справу, мэтанакіраванасць і працаздольнасць. Акрамя таго, гэта не толькі магчымасць рэалізацыі здольнасцяў вучняў, але і спосаб прафесійнага самавызначэння маладых людзей. У 2023/2024 навучальным годзе ў склад каманды Магілёўскай вобласці ўвайшлі 202 вучні. На працягу пяці дзён сакавіка ўдзельнікі выконвалі заданні рознай складанасці, пераадольвалі цяжкасці, набывалі вопыт. Па выніках наша каманда інтэлектуалаў заваявала 95 дыпломаў. Гэта значнае дасягненне, лепшы вынік за апошняе дзесяцігоддзе. Поспехі вучняў у рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах сведчаць, што адукацыя Магілёўскай вобласці рухаецца ў правільным накірунку. Безумоўна, вялікая доля поспеху залежыць ад кампетэнтнасці педагогаў, іх творчай працы, умення разгледзець талент, дапамагчы яму раскрыцца.

Разам з тым сёння павысіўся попыт на кваліфікаваную, творчую асобу настаўніка, здольную навучыць, развіваць і выхоўваць вучняў у сучасным, дынамічным свеце. Развіццё прафесіяналізму педагога — пастаянны ў часе працэс авалодання прафесіяй, які прадугледжвае ўменне рэагаваць на змяненне адукацыйных парадыгмаў, вызначаць эфектыўныя метады, прыёмы і сродкі арганізацыі адукацыйнага працэсу, гатоўнасць асвойваць эфектыўныя адукацыйныя практыкі, дзяліцца сваім вопытам, а таксама займацца самаадукацыяй. Прафесіяналізм педагога прадугледжвае наяўнасць у яго спалучэння прафесійна важных псіхалагічных якасцяў, якія забяспечваюць паспяховае рашэнне прафесійных педагагічных задач па навучанні і выхаванні моладзі. Адным з паказчыкаў узроўню прафесіяналізму настаўніка, яго кампетэнтнасці з’яўляецца выніковасць работы з высокаматываванымі і адоранымі вучнямі, бо, з пункту

гледжання настаўніка, алімпіяда — гэта эксперымент, у рамках якога адораныя вучні дапамагаюць педагогам прааналізаваць сваю дзейнасць у рабоце па засваенні вучнямі інфармацыі па прадмеце.

Самая распаўсюджаная праблема маладога спецыяліста — вялікі запас тэарэтычных ведаў, атрыманых ва ўстанове вышэйшай адукацыі, з аднаго боку, і слабая метадычная падрыхтоўка, няведанне ўсёй разнастайнасці прыёмаў, метадаў і форм навучання, адсутнасць умення прымяняць усё набытае на практыцы, з другога, тым больш у складанай, адказнай і ў той жа момант цікавай рабоце з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі. Як бы паспяхова пачынаючы педагог ні скончыў установу вышэйшай адукацыі, яму трэба будзе прайсці шлях прафесійнага станаўлення і развіцця.

Асноўны інструмент па фарміраванні і развіцці прафесіяналізму педагогаў — рознабакова і добра арганізаваная метадычная работа. Відавочна, вядучую ролю ў дадзеным накірунку адыгрывае абласны інстытут развіцця адукацыі. Асаблівасць арганізацыі метадычнай работы з маладымі спецыялістамі, накіраванай на павышэнне паказчыкаў алімпіяднага руху, пакажам на прыкладзе метадычнага суправаджэння настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

З мэтай аказання кваліфікаванай дапамогі дадзенай катэгорыі педагогаў у Магілёўскай вобласці раз на год праводзіцца двухтыднёвае тэматычнае павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры другой кваліфікацыйнай катэгорыі і без катэгорыі. Так, у 2023–2025 гадах дзейнічае праграма павышэння кваліфікацыі «Прафесійнае станаўленне настаўніка беларускай мовы і літаратуры: адукацыйны патэнцыял, каштоўнасныя арыенціры і ўніверсальныя кампетэнцыі». Два разы на год ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі па тэме «Дыдактычныя асновы і эфектыўныя адукацыйныя практыкі ў рабоце з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”». Мэта павышэння кваліфікацыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры — актуалізацыя і паглыбленне ведаў настаўнікаў пра сучасныя падыходы і спосабы арганізацыі вучэбных (факультатыўных) заняткаў, пазакласнай работы па абазначаным напрамку, прэзентацыя перадавога педагагічнага вопыту, абмеркаванне шляхоў павышэння якасці падрыхтоўкі вучняў, спецыфікі ўзаемадзеяння з законнымі прадстаўнікамі філалагічна адораных вучняў. У рамках павышэння кваліфікацыі наладжваецца раз на тыдзень выхад у загадзя ўзгодненую ўстанову адукацыі. Беларусазнаўцы гэтай установы дзеляцца вопытам работы ў рамках тэмы павышэння кваліфікацыі (4–5 пар). Метадычная работа на гэтым этапе складаецца з адбору прадметнага напаўнення. Асноўная ж задача метадыста — аказаць кваліфікаваную метадычную дапамогу кожнаму з настаўнікаў, якія будуць

праводзіць заняткі, пракансультаваць, каб слухачы на выхадзе атрымалі практыка-арыентаваныя матэрыялы і павысілі ўзровень тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўкі, прафесійна-практычнай кампетэнцыі.

Вялікая колькасць адукацыйных мерапрыемстваў па абазначаным накірунку дзейнасці наладжваецца для маладых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і ў так званы міжкурсавы перыяд. Сярод іх — тэмы «Асноўныя напрамкі падрыхтоўкі вучняў да алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”», «Прадметна-метадычныя аспекты ў рабоце настаўніка-філолага пры падрыхтоўцы вучняў да выканання алімпіяднай комплекснай работы», «Прадметна-метадычныя аспекты ў рабоце настаўніка-філолага пры падрыхтоўцы вучняў да тура алімпіяды “Водгук на мастацкі твор”» і інш. Пры выбары формы правядзення большы ўпор робіцца на тыя, якія ставяць на мэце практычную рэалізацыю і ўзаемадзеянне педагогаў: майстар-клас, урок для дарослых, трэнінг, практыкум і інш. Падчас работы ў групах удзельнікі практыкумаў адпрацоўваюць найбольш эфектыўныя метады і прыёмы падрыхтоўкі вучняў да прадметнай алімпіяды, выконваюць заданні алімпіяднага характару з мэтай удасканалення не толькі метадычнай кампетэнцыі, але і прадметнай. Пры арганізацыі адукацыйных мерапрыемстваў значны ўплыў на павышэнне кампетэнтнасці настаўнікаў вобласці аказвае актыўнае супрацоўніцтва з іншымі рэгіёнамі, цесная ўзаемасувязь з выкладчыкамі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, сумесная работа з Акадэміяй адукацыі. Відавочна, што калі малады педагог не будзе вучыцца на вопыце, то ніколі не стане майстрам. Абавязкова да ўдзелу ў правядзенні заняткаў з маладымі спецыялістамі прыцягваюцца настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, у большасці — настаўнікі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст».

У межах міжкурсавога перыяду ў рэгіёне функцыянуе абласная школа маладога настаўніка. Заняткі накіраваны на фарміраванне прадметных і метадычных кампетэнцый, а самае галоўнае — на ўкараненне ў практыку пачынаючых настаўнікаў эфектыўнага педагагічнага вопыту. Пры гэтым неабходна адзначыць, што пры правядзенні выніковай атэстацыі на павышэнні кваліфікацыі, мерапрыемстваў дадатковай адукацыі, здачы экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, выездаў на вучэбна-метадычныя аб’яднанні праводзіцца работа па выяўленні эфектыўнага педагагічнага вопыту. Вынік — публікацыя вытворча-практычных выданняў, абавязковы ўдзел настаўнікаў вобласці ў адукацыйных мерапрыемствах, у тым ліку і для маладых спецыялістаў, з прадстаўленнем уласнага вопыту работы.

Алімпіяднаму руху мы надаем павышаную ўвагу, пачынаючы з верасня і да канца чэрвеня. У вобласці выпрацавана сістэма работы, якая, як адзначалася вышэй, дае станоўчыя вынікі. Так, у вобласці працуе абласны рэсурсны цэнтр па падрыхтоўцы вучняў да ўдзелу ў рэспубліканскай алімпіядзе. У творчую групу абласнога рэсурснага цэнтра па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», якая зацверджана на ўзроўні галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, уваходзяць настаўнікі, чые вучні неаднаразова станавіліся пераможцамі алімпіяды на заключным этапе. Метадыст інстытута развіцця з'яўляецца кіраўніком творчай групы. У рамках абласнога рэсурснага цэнтра ў дыстанцыйным фармаце з верасня па май, акрамя работы з вучнямі, праводзяцца заняткі раз на месяц з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры вобласці. Створаная сістэма вырашыла кадравую праблему: з лепшымі вучнямі працуюць лепшыя педагогі вобласці, вучні гарадской і сельскай мясцовасці ў роўных умовах, педагогі транслююць эфектыўны педагагічны вопыт па рабоце з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі.

Напрыканцы адзначым, што граматна арганізаваная інстытутам развіцця адукацыі метадычная работа па станаўленні і развіцці маладога спецыяліста садзейнічае не толькі ўдасканаленню прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў, але і, як вынік, усебаковаму развіццю школьнікаў, іх паспяховай будучыні, садзейнічае пабудове моцнай і квітнеючай дзяржавы.